# Раздзел II. ТЭАРЭТЫЧНЫЯ І МЕТАДАЛАГІЧНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ДЗЯРЖАВЫ І ПРАВА БЕЛАРУСІ

## АБ ТЭАРЭТЫКА-МЕТАДАЛАГІЧНЫХ ПРАБЛЕМАХ ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАЎНАСЦІ

**С. А. Калінін**

***Уводзіны.*** Прэамбула Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь спасылаецца на шматвяковую гісторыю беларускай дзяржаўнасці, але ў адрозненне ад бліжэйшых суседзяў яе існаванне не мае адназначнага факталагічнага, гісторыясофскага і наратыўна-ідэалагічнага лінейнайга разумення. Але наяўнасць дзяржаўнасці на тэрыторыі сучаснай Беларусі або на этнічна блізкіх землях, ў тым ліку ў межах Рэчы Паспалітай, Расіі, Польшчы, або ў межах іх тэрытарыяльных, ідэалагічных і цывілізацыйных прэтэнзій дазваляе ставіць пытанне аб яе дачыненні да сучаснай беларускай дзяржавы. Фарміраванне ўласнай нацыянальнай дзяржавы на гэтых землях пачынаецца толькі пасля рэвалюцыйнага перыяду (БНР, БССР, ЛітБел і г. д.). Таму гісторыя дзяржаўнасці Беларусі часта разглядаецца як пэўны антытэзіс гісторыі дзяржаўнасці Расіі і Польшчы, як спроба супрацьпастаўлення атаясамленню Беларусі з іншымі дзяржаўнымі суб'ектамі імперскага тыпу. Гэта актуалізуе праблему метадалогіі даследавання беларускай дзяржаўнасці, распрацоўкі якасна новых і абнаўлення існуючых метадалагічных падыходаў, спрыяе павышэнню ступені міждысцыплінарных даследаванняў у гэтай галіне.

***Асноўная частка.*** Навуковае даследаванне любых феноменаў мае сваёй мэтай вылучэнне, замацаванне, тлумачэнне і інтэрпрэтацыю пэўных фактаў. Пры гэтым тлумачэнне і інтэрпрэтацыя ажыццяўляюцца на падставе пэўнай гіпотэзы, якая потым складаецца ў канцэпцыю або тэорыю і выступае крытэрыем адбору факталагічнага матэрыялу, яго адзнацы як заканамернага або выпадковага, значнага або нязначнага і г. д. Адначасова факталогія ўплывае на любыя тэарэтыка-метадалагічныя канструкцыі, бо увядзенне новай фактуры патрабуе новага адэкватнага адлюстравання.

Навуковая канцэпцыя (гіпотэза) ужо ўтрымлівае ў сабе пэўныя метадалагічныя пастулаты, якія абумоўліваюць навуковыя вывады. Метадалогія любой навукі, у тым ліку тэорыі і гісторыі дзяржавы і права, уключае ў сябе складаны комплекс інструментаў, дазваляючых адэкватна даследаваць розныя ўзроўні прадметнай рэчаіснасці. Пры гэтым метады, адэкватныя для аднога ўзроўню, страцяць такую якасць пры выкарыстанні

на іншым. У метадалогію навукі ўключаюцца светапоглядныя тэарэтыка-пазнавальныя парадыгмы, філасофскія асновы навукі, катэгарыяльна-тэрміналагічны апарат, метады, стандарты, заканамернасці, прэзумпцыі пазнавання і г. д. Пры гэтым агульныя светапоглядныя і метадалагічныя прынцыпы пазнавання ў сучаснай філасофіі навукі ахопліваюцца тэрмінам «філасофскія асновы навукі» (В. С. Сцёпін), што азначае сукупнасць філасофскіх ідэй, якія абгрунтоўваюць найбольш базавыя прынцыпы і перспектывы навуковага пазнавання ў пэўным культурна-гістарычным кантэксце.

Філасофскія асновы навукі як зыходны метадалагічны прынцып дазваляюць вылучыць класічны, некласічны і постнекласічны тыпы навукі, кожны з якіх мае адэкватныя (для сябе) уяўленні і апісанні рэчаіснасці, у тым ліку дзяржаўна-прававыя, якія грунтуюцца на пэўных прэзумпцыях, ідэалах і нормах апісання і даследавання. Прычым змена любой такой прэзумпцыі, або нормы, цягне карэкціроўку ўсёй тэарэтыка-метадалагічнай канструкцыі.

Класічная навука засноўваецца на прэзумпцыі суверэннасці чалавечага розуму ў пазнаванні абсалютнай аб'ектыўнай ісціны і выкарыстоўвае жорстка дэтэрмінаванае механічнае апісанне рэчаіснасці. Адной з праяў такой механічнасці з'яўляецца лінейная гістарычная парадыгма, якая ў малой ступені адэкватная для Беларусі і больш прыдатная да гісторыі Расіі і Польшчы. Трэба заўважыць, што і ў дачыненні да названых краін лінейнасць «працуе» толькі на гісторыясофскім і ідэолага-наратыўным узроўнях, не будучы пацверджанай фактalогіяй. Напрыклад, сучасная Расія лінейна выводзіць сваю дзяржаўнасць з Кіеўскай Русі, хаця Русь і Расія зусім розныя дзяржаўныя ўтварэнні, а Кіеўская спадчына аднолькава належыць і сучасным Беларусі і Украіне. Адзначым, што класічная навука ўжо ў канцы XVIII – пачатку XIX ст. страціла сваю адэкватнасць, увайшоўшы ў якасці прыватнай канцэпцыі ў некласічную навуку.

Некласічная навука абгрунтавала прынцыпы рэлятэвізму, дадатковасці, залежнасці метадалагічных стандартаў ад працэсу пазнавання, суб'екта пазнавання і тыпу вывучаемых аб'ектаў. Гэта дазволіла адэкватна разглядаць прадмет даследавання з розных бакоў (сацыяльна-гістарычнае, культурнае, светапогляднае і іншыя вымярэнні), прасочваць яго эвалюцыю і развіццё ў часе і прасторы.

Сучасная постнекласічная навука распрацоўвае метады, звязаныя са складанай дынамікай пазнаваемых феноменаў, якія немагчыма выключыць з пэўнага культурна-гістарычнага кантэксту; пераглядае ролю суб'екта пазнавання, які таксама знаходзіцца ў такім кантэксце, а яго сацыяльна-гістарычныя характарыстыкі істотна ўплываюць на вынікі даследавання. У такім тыпе навукі значную ролю адыгрывае канвенцыяналізм (лац.

*conventio* – пагадненне), якi ставiць iнтэрпрэтацыю фактаў у залежнасць ад пагаднення суб’ектаў пазнавання. Напрыклад, лiтоўская гiстарыяграфiя канвенцыянальна атаясамляе летапiсную Лiтву i сучасную Летуву. У беларускай гiстарыяграфii Вялiкае Княства Лiтоўскае, Рускае i Жамойцкае часам называюць беларускай дзяржавай.

Постнекласiчная гуманiтарная навука спрабуе растлумачыць i вывучыць глабальную светапабудову, месца чалавека ў сацыяльным сусвеце i г. д. Для яе характэрна мiждысцыплiнарная iнтэграцыя i трансляцыя ведаў i iдэй з наступным уключэннем iх у агульнанавуковую карцiну сусвету [5, с. 319]. Постнекласiчная навука мае ўласную трактоўку метаду сiстэмнага аналiзу, бо разглядае феномены як сiстэмы, якiя маюць рысы ўнiкальнасцi, самаразвiцця, неадваротнасцi, нелiнейнасцi, дынамiзму, самаарганiзацыi пры праходжаннi пунктаў няўстойлiвасцi («бiфуркацыi»). У вынiку феномен метадалагiчна разглядаецца як складаны[1], спецыфiчна верагоднасны па сваёй прыродзе, якi функцыянуе на падставе прынцыпаў варыятыўнасцi i альтэрнатыўнасцi свайго iснавання. Нелiнейнасць развiцця феномена забяспечваецца праз аб’ектывацыю толькi аднога з магчымых варыянтаў развiцця, кожны з якiх радыкальна змяняе сiстэму. Так, Ягайла меў як мiнiмум дзве магчымасцi ўступлення ў шлюб: з польскай каралеўнай (рэалiзаваная магчымасць) i дачкой Вялiкага князя Маскоўскага (нерэалiзаваная магчымасць). Пры гэтым магчымы iншы выбар кардынальна б змянiў сусветную гiсторыю.

Такiм чынам, дзяржава, i беларуская ў тым лiку, можа быць прадстаўлена ў выглядзе арганiчнай, дынамiчнай, нелiнейнай, самаарганiзуемай, самарэгулюемай, нераўнаважнай сiстэмы, якая знаходзiцца пад уплывам комплексу розных знешнiх i ўнутраных выклiкаў (Хаоса) i павiнна рэагаваць на такiя выклiкi, у тым лiку праз знешнiя i ўнутраныя змены. У вынiку гiсторыя любой дзяржавы ў нелiнейнай метадалогii выступае складаным комплексам узаемадзейнiчаючых, у тым тым лiку i праз узаемавыключэнне, тэндэнцый, якiя маюць здольнасць да версiфiкацыi перспектыўных шляхоў свайго развiцця. Гэта робiць даступным магчымасць любой радыкальнай трансфармацыi дзяржаўнасцi пры прынцыповай адсутнасцi канчатковасцi i абумоўлiвае той факт, што гiстарычна паслядоўныя формы дзяржаўнасцi, яе палiтычныя i прававыя рашэннi не з’яўляюцца прамым вынiкам i наступствам папярэднiх форм.

Як ужо адзначалася, значным для метадалогii з’яўляецца вызначэнне асноўных зыходных аксiём пазнавання, якiмi мы лiчым наступныя.

---

[1] Складанасць адлюстроўвае наяўнасць здольнасцi да самаарганiзацыi за межамi стану раўнавагi, якая забяспечвае змены прасторава-часавай структуры на макраскапiчным узроўнi па прычыне змен, якiя адбываюцца на мiкраскапiчным узроўнi.

1. Беларуская дзяржаўнасць – гэта абагульняльны тэрмін, які вызначае дзяржаўна-прававыя феномены, якія існавалі на тэрыторыі сучаснай Беларусі або на этнічна блізкіх землях. Выкарыстанне яго выцякае з Прэамбулы Канстытуцыіі Рэспублікі Беларусь. Пры гэтым трэба ўлічваць, што такі тэрмін ёсць спроба рэтраспектыўнай пабудовы гісторыі з пазіцыі сучаснасці, бо Беларусь як суверэнная дзяржава і сучасныя беларусы як нацыя складіся даволі позна (другая палова XIX – пачатак XX ст.[1]). Гэта значыць, што гістарычны аналіз дзяржаўнасці трэба праводзіць адначасова з як мінімум дзвюх пазіцый: рэтраспектыўнай *сучаснай* пазіцыі адзнакі гістарычных падзей і пазіцыі адзнакі з боку *тагачасных* суб'ектаў. Беларуская дзяржаўнасць складана перасякаецца з рэтраспекцыяй дзяржаўнасці іншых народаў, кожны з якіх прэтэндуе на яе як на *ўласную* гістарычную спадчыну.

2. Складанасць вызначэння цывілізацыйнай прыналежнасці сучаснай Беларусі, якая адначасова ўключалася як у гісторыю Заходняй, так і Усходняй хрысціянскіх цывілізацый. Фактычна на тэрыторыі Беларусі адбываўся (і адбываецца) цывілізацыйны канфлікт, спробы падпарадкаваць Беларусь толькі аднаму з цывілізацыйных стандартаў, якія лічаць гэтую тэрыторыю *сваёй* і адводзяць беларускаму народу пэўнае месца ў *сваёй* гісторыі (мы не кажам аб якасці такога месца і ролі, якая навязваецца або будзе прапаноўвацца беларусам, бо гэта не з'яўляецца прадметам даследавання). Наадварот, Беларусь і беларускі народ маюць уласныя ўяўленні аб сваім месцы і ролі ў гісторыі, што можа не супадаць з чаканнямі іншых цывілізацыйных суб'ектаў. У выніку гэта прыводзіць да канфліктнасці рознанакіраваных культурна-гістарычных чаканняў і інтарэсаў, што абумоўлівае дзяржаўную, прававую і іншую палітыку як Беларусі, так і ў дачыненні да Беларусі.

3. Перарыўнасць беларускіх дзяржаўных і прававых традыцый з адначасовай іх уключанасцю ў розныя цывілізацыйна-дзяржаўныя праекты, што абумовіла своеасаблівасць дзяржаўнай палітыкі, у тым ліку права. Першапачаткова сучасныя беларускія землі цягнуліся да ўсходняй славянска-праваслаўнай цывілізацыі. Але ўжо з XI ст. яны пападаюць у арбіту зацікаўленасці Польшчы (шырэй – Захаду), якая прыняла хрышчэнне па рымскім абрадзе, што абумовіла *знешні* славянскаафарбаваны канфлікт Каталіцызму і Праваслаўя на землях Усходняй Еўропы. Потым фактарам заходняга ўплыву быў крыжацкі фактар. Праз Крэўскую унію ВКЛ было ўключана ў арбіту Захаду, што парадзіла ўнутраную экспансію каталіцызму

[1] Дарэчы, праблема вызначэння канчатковага часу фарміравання беларускай нацыі ў беларускай навуцы яшчэ адназначна не вырашана.

і паступовае мэтанакіраванае выцісканне праваслаўна-славянскага элементу ў дзяржаве[1].

Названая перарыўнасць абумовіла пэўны раскол у ідэнтычнасці насельніцтва, у тым ліку сучаснага, бо кожная сацыяльная група можа «выбраць» сабе больш прыдатны праект дзяржаўнага будавання, адэкватны толькі для аднаго цывілізацыйнага стандарту, і выступаць супраць іншых, разглядаць іх у якасці «магільшчыкаў сапраўднай беларускай дзяржавы».

4. У сучаснасці Беларусь больш прыцягваецца да ўсходне-праваслаўнай (савецкай, постсавецкай) цывілізацыі, што абумоўлена знаходжаннем Беларусі ў яе лоне апошнія 200 год. Іншыя цывілізацыйныя стандарты, якія існавалі тады ў выглядзе верагоднасці развіцця беларускай дзяржаўнасці (або іншай дзяржаўнасці на гэтых землях), аб'ектыўна выступалі супраць такога знаходжання і прапаноўвалі свае мадэлі дзяржаўнага будаўніцтва. Вельмі распаўсюджаным у такіх умовах з'яўляецца даволі спрэчнае сцвярджэнне аб барацьбе «дэмакратычных традыцый беларускага (літоўскага, польскага, украінскага) народа» супраць «дэспатычных традыцый Масковіі (Расіі)». Такое сцвярджэнне з'яўляецца апастэрыорным пераносам сучасных уяўленняў аб непазбежнасці дэмакратыі на іншыя культурна-цывілізацыйныя і гістарычныя стандарты.

5. Некрытычнасць выкарыстання для апісання працэсаў гістарычнага дзяржаўнага і прававога будавання сучасных ліберальных канцэпцый, а таксама пошук у гістарычным мінулым фактаў і «фактаў», якія б сцвярджалі аб «шматвяковых дэмакратычных традыцыях». Такая не вельмі карэктная тэндэнцыя даволі часта дазваляе ігнараваць культурна-гістарычны кантэкст прыняцця пэўных дзяржаўных і прававых рашэнняў, грунтуючыся толькі на аналізе пэўных пісьмовых крыніц без уліку шырокага сацыялагічнага кантэксту.

Напрыклад, Прывілей Вялікага князя Аляксандра 1492 г. аб абмежаванні ўлады Вялікага князя на карысць Рады разглядаецца як «першая феадальная канстытуцыя», «своеасаблівая канстытуцыя дзяржавы» [9, с. 186; 2, с. 86]. Але калі ўзяць пад ўвагу, што бацька Аляксандра Казімір Ягелончык вельмі актыўна падтрымліваў ідэю панавання Ягелонаў ва Усходняй Еўропе, ахвяраваўшы інтарэсамі Вялікага княства на Усходзе [3, с. 13–14], то Прывілей 1492 г. выглядае супрацьстаяннем магнатаў Вялікага Княства інтарэсам Ягелонскай дынастыі. Такім чынам, прычынай узвышэння Рады ў адносінах да Вялікага князя з'яўлялася асабістая унія

[1] Так, у 1550 г. Міхалон Літвін, ігнаруючы славянскую («рускую») большасць Вялікага Княства, пісаў на лаціне: «Мы изучаем московские письмена, не несущие в себе ничего древнего, не имеющие ничего, что бы побуждало к доблести, поскольку рутенский язык, чужд нам литвинам, то есть италианцам, происшедшим от италийской крови» [4, с. 85–86]. Гэтае ігнараванне не ўмацоўвала дзяржаву.

Польшчы і Вялікага Княства, Рада стварала пэўную сістэму стрымак і супрацьваг, бо не была ўпэўнена ў шчырым выкананні Гаспадаром сваіх абавязкаў у дачыненні да Літвы. Але адначасова ў Польшчы адбывалася тэндэнцыя павышэння ролі дробнай шляхты і заняпаду цэнтральнай ўлады, што, без сумневу, падагравала інтарэсы адпаведных колаў у Вялікім Княстве. Вялікі князь меў у Літве больш улады, чым кароль у Польшчы, дзе ён адчуваў націск з боку магнатаў і шляхты і, каб задаволіць іх, а таксама рэалізаваць дынастыйныя інтарэсы, ахвяраваў інтарэсамі Вялікага Княства на карысць Польшчы і Ягелонаў. Напрыклад, Казімір Ягелончык не змог дапамагчы хану Залатой Арды Ахмату ў барацьбе з Масквой (стаянне на Угры), што дазволіла Вялікаму княству Маскоўскаму атрымаць незалежнасць і пачаць прэтэндаваць на «Кіеўскую спадчыну», паставіўшы пад пагрозу ўсходнія межы Вялікага Княства. Такім чынам, дзяржаўныя і прававыя рашэнні трэба разглядаць не як тэкст, але як пэўны вынік узаемадзеяння складаных дынамічных знешніх і ўнутраных тэндэнцый.

6. Стварэнне незалежнай Беларускай дзяржавы ў канцы XX ст. актуалізавала неабходнасць стварэння ўласнага палітыка-прававога абгрунтавання дзяржаўнага будаўніцтва, у тым ліку праз творчае пераасэнсоўванне савецкай спадчыны (што было характэрна для афіцыйнай палітыкі Беларусі) і звароту да ўласных нацыянальных дарэвалюцыйных і дасавецкіх традыцый[1]. Спроба ігнаравання і адмаўлення «тыранічнай» і «дэспатычнай» савецкай спадчыны была больш удалай у Прыбалтыцы, дзе Праваслаўе не было дамінуючай рэлігіяй, а вяртанне ў лона «агульнаеўрапейскай цывілізацыі», на першы погляд, з'яўлялася заканамерным. Расія таксама ідэалагічна была здольная ігнараваць савецкую спадчыну, бо мела салідны багаж імперскіх дактрын, якія падкрэслівалі яе сутнаснае адрозненне ад заходнееўрапейскай цывілізацыі.

Беларусь не мела такой адназначнай палітыка-прававой і ідэалагічнай спадчыны, бо на яе адначасова ўплываў складаны комплекс ўсходніх і заходніх тэндэнцый, якія творча пераасэнсоўваліся (да пэўнага гістарычнага моманту) пры прыняцці дзяржаўных рашэнняў. Некрытычнае прынятце як заходніх, так і ўсходніх поглядаў на развіццё дзяржавы ставіла б Беларусь у становішча *аб'екта* гістарычных прэтэнзій як Польшчы, так і Расіі. Але стварэнне ўласнай дзяржаўнасці патрабуе асэнсавання сябе як суб'екта, здольнага ставіць і дасягаць уласных мэт, супрацьстаяць разгляданню сябе ў выглядзе аб'екта палітыкі іншых дзяржаў. Напрыклад, не з'яўляецца сакрэтам, што Польшча падштурхоўвала Вялікае Княства да ўступлення ў Лівонскую вайну, каб, скарыстаўшыся цяжкасцямі Літвы,

[1] Адзначым, што зварот да нацыянальных традыцый мог суправаджацца адмаўленнем савецкай гісторыі.

прымусіць яе да уніі, Савецкі Саюз перадаваў беларускія землі (Вільня, Падляшша) для дасягнення ўласных інтарэсаў.

7. Спецыфічнасць развіцця беларускай дзяржаўнасці, якая як феномен Памежжа не магла быць эталоннай для выключна Заходняй або Усходняй цывілізацый, бо мела з імі як адпаведныя, так і супярэчлівыя рысы. Пры гэтым як Захад, так і Усход (у выглядзе Польшчы і Расіі) прагнулі вынішчыць названыя асаблівасці, прывесці да ўласнага эталону. У гэтых умовах дзяржаўная палітыка ў значнай ступені інтуітыўна выкарыстоўвала складаны комплекс мер і метадаў па дасягненні ўласных інтарэсаў.

8. Вышэйназванае абумоўлівае складанасць і супярэчлівасць ідэалагічнай і светапогляднай спадчыны сучаснай беларускай дзяржаўнасці, якая ў адрозненне ад Польшчы і Расіі не мае рэальнай або міфалагізаванай адзінай лініі дзяржаўнага развіцця. Гэта ставіць праблему таго, у якой ступені адпаведныя феномены дзяржаўнага і прававога будавання, якое адбывалася на тэрыторыі Беларусі, адпавядалі інтарэсам гэтай тэрыторыі. Пэўнай парадаксальнай гіпотэзай, якая характарызуе і абгрунтоўвае раней сказанае, можа быць сцвярджэнне, што не ўсякая дзяржаўнасць (або не ва ўсе яе часы), якая была на тэрыторыі Беларусі, адлюстроўвала і адстойвала інтарэсы яе насельніцтва, а больш дбала пра інтарэсы іншых суб’ектаў. Мы можам выкарыстоўваць тэзіс М. Я. Данілеўскага аб выкананні беларускай дзяржаўнасцю ролі этнаграфічнага матэрыялу для іншых суб’ектаў. Гэта абгрунтоўвае большую вагу метадалагічнага прынцыпу нелінейнай дынамікі, які грунтуецца на варыятыўнасці дзяржаўнага будаўніцтва і яго невідавочнай самаарганізацыі пры праходжанні пунктаў няўстойлівасці, у якіх беларуская дзяржаўнасць якасна змяняецца па адным з варыянтаў развіцця. Пры гэтым нерэалізаваныя праекты таксама аказваюць націск на развіццё дзяржаўнасці. Напрыклад, праваслаўная большасць насельніцтва Вялікага Княства патрабавала ад улад адпаведнай палітыкі, якая вагалася ад спробы прымусовага пераводу ў каталіцтва да пэўных перыядаў спакойных адносін.

9. Складанасць заходніх уплываў на беларускую дзяржаўнасць. З аднаго боку, праз Крэўскую унію Вялікае Княства было ўключана ў арбіту заходняй цывілізацыі. Выключна заходнія карані беларускай дзяржаўнасці адлюстроўваюцца Рымскай Каталіцкай царквой, уніямі з Польшчай, інтарэсамі дынастыі Ягелонаў, дзяржаўнасцю Рэчы Паспалітай і міжваеннай Польшчай.

З другога боку, заходні ўплыў ажыццяўляўся і ў перыяд знаходжання тэрыторыі Беларусі ў складзе Расійскай імперыі і Савецкага Саюза. Так, пачынаючы з Пятра I, Расія вельмі актыўна запазычвае заходнія мадэлі развіцця дзяржаўнасці, адракаючыся ад самабытных каранёў. Славянафільская рэакцыя XIX ст., нягледзячы на спробу ўкаранення ў славяна-

праваслаўнай дзяржаўнасці, больш адпавядала заходняй тэндэнцыі рамантызму. Савецкі Саюз, у сваю чаргу, быў пабудаваны на заходняй канцэпцыі марксізму і камунізму. Такім чынам, шмат якія «усходнія» традыцыі дзяржаўнага будаўніцтва маюць заходні характар, але якія набылі пэўную спецыфіку з прычыны рэалізацыі ў незаходняй цывілізацыі.

Нявызначанасць пастаўленай праблемы з'яўляецца фактарам няўстойлівасці для беларускай дзяржаўнасці, якая (няўстойлівасць) у постнекласічнай парадыгме стымулюе развіццё дзяржавы, ствараючы феномены, якія самаарганізуюць нацыянальную дзяржаўнасць, але мала адпавядаюць «кананічным» метадалагічным падыходам, адэкватным для сучасных суседніх дзяржаў, якія маюць з Беларуссю агульную гісторыю.

10. Аналіз палітыка-прававой спадчыны Беларусі вельмі часта праводзіцца праз апалагетычнае і дагматычнае ўспрыняцце сучаснага лібералізму і звязаных з ім канцэпцый у якасці безальтэрнатыўных спосабаў кіравання грамадствам. Такая тэндэнцыя, дарэчы, з'яўляецца агульнай [6, с. 251]. Але гэта ігнаруе факт узнікнення лібералізму ў пэўным культурна-гістарычным кантэксце і неабходнасць яго адпаведнай карэкціроўкі і адаптацыі для іншых умоў. На наш погляд, больш карэктнай метадалагічнай пасылкай будзе з'яўляцца вывучэнне *адэкватнасці* дзяржаўных і прававых рашэнняў тым праблемам, якія стаялі перад пэўным дзяржаўным утварэннем у пэўны гістарычны перыяд, іх накіраванасць на рашэнне каротка- або доўгатэрмінавых праблем, іх сацыяльную падтрымку і г. д.

Адначасова ў метадалогіі даследавання дзяржаўнасці трэба ўлічваць даўно вядомую і актыўна распрацоўваемую на Захадзе праблему крызісу дэмакратыі [10; 11; 12]. Гэта дазваляе ставіць пытанне аб той ролі, якую выконвалі прадстаўнічыя ардынарныя і неардынарныя, накшталт канфедэрацый, органы ў існаванні беларускай дзяржаўнасці, аб перыядах іх станоўчага і адмоўнага ўплыву [1, с. 31–37].

У якасці цікавага метадалагічнага тэзісу можна прывесці думку Гельмута Шёка аб тым, што «на самом деле современные демократии спасает от анархического рессентимента[1] не степень равенства de jure или de facto, а длительное существование институтов, унаследованных моделей поведения, литературных и религиозных этических идеалов, которые позволяют достаточному числу граждан продолжать осознавать ограничения, наложенные на возможность взаимных сравнений, и, следовательно, обеспечивают социальный мир» [7, с. 368]. Трансляцыя гэтага тэзісу на беларускую гісторыю ў якасці пэўнага «парадыгмальнага пераносу» патрабуе больш актыўна вывучаць культурна-гістарычны кантэкст прыняцця палітычных і прававых рашэнняў. Напрыклад, для Кароннага ўрада больш карысным

---

[1] Тэрмін, які азначае «пачуццё крыўды».

было распаўсюджанне каталіцтва, хоць гэта і прывяло да страты значнай часткі Украіны. Крызіс і ліквідацыя Польскай дзяржаўнасці ў рэлігійных адносінах сталі пэўнай перамогай Папства.

11. Дынамізм дзяржаўнасці абумоўлівае магчымасць пэўнай змены гістарычных фактаў і канцэпцый, на якіх такая дзяржаўнасць грунтуецца. Гэта патрабуе вызначэння рацыянальных і ірацыянальных адносін сучаснасці да ўласнай гісторыі, уключаючы рэальны і віртуальны (наратыўны) палітыка-прававы вопыт розных дзяржаўных утварэнняў, у якіх знаходзіліся сучасныя беларускія землі. Але адзнака такога вопыту, бясспрэчна, вызначаецца зыходнымі светапогляднымі характарыстыкамі суб’екта даследавання і ўспрыняцця, яго стаўленнем да рэальнай і ўспрымаемай гісторыі, яго ідэнтыфікацыяй з пэўнымі гістарычнымі суб’ектамі і працэсамі. Але пры такой ідэнтыфікацыі трэба ўлічваць, што гістарычны суб’ект меў іншую ідэнтыфікацыйную іерархію, чым сучасны даследчык. Напрыклад, Жыгімонт III Ваза, выхаванец іезуітаў, больш дбаў пра інтарэсы Каталіцкай Царквы, чым пра інтарэсы Рэчы Паспалітай.

***Заключэнне.*** Гісторыя беларускай дзяржаўнасці з’яўляецца вельмі складанай па шэрагу прычын, з якіх найбольш значнай з’яўляецца адсутнасць «лінейнай» традыцыі дзяржаўнасці. Даволі распаўсюджанай для беларускай гісторыі тэндэнцыяй з’яўляецца перарыў дзяржаўных і прававых традыцый [8] з наступным уключэннем беларускіх зямель у межы іншых дзяржаўнасцей (Расіі і Польшчы). Але перарыўнасць не ліквідавала магчымасць адраджэння былых традыцый, якія працягвалі існаваць і аказваць пэўны ўплыў на дзяржаўную і прававую палітыку.

Даследаванне беларускай дзяржаўнасці мае некалькі накірункаў, з якіх найбольш важнымі можна лічыць назапашванне гістарычных фактаў, іх супастаўленне (вылучэнне і ўключэнне) з гісторыяй іншых дзяржаў, а таксама пераасэнсаванне зыходных тэарэтыка-метадалагічных аксіём разумення працэсу нацыянальнага дзяржавабудавання. Пры гэтым пераасэнсаванню падлягаюць найбольш агульныя метадалагічныя ўстаноўкі, што можна ахарактарызаваць як «навуковую рэвалюцыю», якая адбылася па прычыне змены парадыгмальных аксіём даследавання. Лічым, што для даследавання айчыннай гісторыі дзяржавы і права больш адэкватнай будзе постнекласічная навуковая парадыгма, якая абгрунтоўвае нелінейны падыход да даследавання дзяржавы як складанага феномена. Выкарыстанне такой парадыгмы і названых у артыкуле метадалагічных прынцыпаў і палажэнняў патрабуе змены суадносін паміж агульнай гісторыяй (у тым ліку Беларусі), гісторыяй дзяржавы і права, а таксама агульнай тэорыяй права, больш актыўнага выкарыстання сацыялагічных і культуралагічных падыходаў, якія дазваляюць разглядаць палітычныя і прававыя рашэнні не проста як дадзены факт (тэкст), а як вынік складаных узаемадзеянняў

суб'ектаў, існуючых у пэўным гісторыка-культурным кантэксце і маючых уласныя мэты і стэрэатыпы паводзін.

Такім чынам, вывучэнне беларускай дзяржаўнасці патрабуе далейшай распрацоўкі праблем агульнай метадалогіі і правядзення міждысцыплінарных даследаванняў.

### Літаратура


1. *Вайшвила, А.* Литовский статут: между прогрессом и регрессом / А. Вайшвила // Статут Вялікага княства Літоўскага 1529 года – падмурак развіцця беларускай дзяржаўнасці і канстытуцыяналізму (да 480-годдзя прыняцця): сб. науч. тр. / БГУ, юрид. фак.; редкол. С. А. Балашенко – Минск: РИВШ, 2009. – С. 31–37.

2. *Доўнар, Т. І.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. – Мінск: Амалфея, 2008. – 399 с.

3. *Любая, А. А.* Татарскі фактар ўзаемаадсінаў дзяржаў Усходняй Еўропы ў канцы XV – першай трэці XVI ст.: аўтарэф. ... дыс. канд. гіст. навук: 07.00.03 / А. А. Любая; Беларус. дзярж. ун-т. – Мінск, 2009. – 25 с.

4. *Михалон Литвин.* О нравах татар, литовцев и москвитян / Михалон Литвин; [пер. с лат. В. И. Матузовой; вступ. ст. М. В. Дмитриева [и др.]. с. 5–56; Коммент. С. В. Думина и [и др.]. – М.: Изд-во МГУ, 1994. – 146 с.

5. *Степин, В. С.* Теоретическое знание / В. С. Степин. – М.: Прогресс-Традиция, 2003. – 743 с.

6. *Суслов, Е. В.* Трансформация представительной демократии в «представительскую»: конфигурация явления / Е. В. Суслов // Парламентаризм в России: исторический опыт и современные проблемы: материалы Всерос. науч.-практ. конф., посвящ. 100-летию начала деятельности первой российской Государственной думы. Красноярск, 18 мая 2006 года / редкол.: В. В. Гришаев (отв. ред.) [и др.]. – Красноярск: Красноярский писатель, 2006. – С. 251–253.

7. *Шёк, Г.* Зависть: Теория социального поведения / Г. Шёк. – М.: ИРИСЭН, 2008. – 554 с.

8. *Щербик, Д. В.* Дискретность и преемственность в развитии права Беларуси: автореф. ... дис. канд. юрид. наук: 12.00.01 / Д. В. Щербик; Белорус. гос. ун-т. – Минск, 2009. – 24 с.

9. *Юхо, Я. А.* Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Я. А. Юхо. – Мінск: РІВШ БДУ, 2000. – 349 с.

10. *Crozier, M.* The Crisis of Democracy: Report on the Governability of Democracies to the Trilateral Commission / Michel Crozier, Samuel Huntington, Joji Watanuki. – N.-Y., 1975. – 221 p.

11. *Schmitt, K.* The crisis of parliamentary democracy / Carl Schmitt; Transl. by Ellen Kennedy. – Cambridge (Mass.); London: MIT press, Cop. 1985. – XL, 132 c.

12. The Crisis of representative democracy / Intern. progress organization; Ed. by Hans Köchler. – Frankfurt a.M. etc.: Lang, 1987. – 306 c.